УДК 808.26-3

**Міхаіл Шаўчэнка***

# КАЛАРОНІМЫ І ЛЮКСОНІМЫ ЯК СРОДАК СТВАРЭННЯ МАСТАЦКАЙ ВОБРАЗНАСЦІ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЕ В. ІПАТАВАЙ І У. КАРАТКЕВІЧА

У артыкуле разглядаецца колеравая і светлавая лексіка, пры дапамозе якой аўтары ствараюць вобразную сістэму мастацкага тэксту. Яна з'яўляецца ўніверсальным сродкам пры стварэнні вобразна-экспрэсіўнай характарыстыкі рэальнай, этнакультурнай прасторы. Выкарыстанне каларонімаў і люксонімаў у гістарычнай прозе аўтараў, іх моўная інтэрпрэтацыя паказвае на вызначэнне індывідуальна-аўтарскай спецыфікі ўспрыняцця колеру пісьменнікам і адэкватную асацыятыўную сувязь колеравых камбінацый, якія ўзнікаюць у чытача.

**Ключавыя словы**: каларонім; люксонім; сродкі мастацкай вобразнасці; аўтарскі стыль; успрыняцце мастацкага слова.

**Shevchenko Mikhail. Coloronyms and luxonyms as a means of creating artistic image in historical prose by V. Ipatova and V. Karatkevich.**

The article examines the color and light vocabulary, with the help of which the authors create a figurative system of artistic text. It is a universal tool for creating a figurative and expressive characteristics of a real, ethnocultural space. The use of coloronyms and luxonyms in the historical prose of the authors, their linguistic interpretation indicates the determination of the individual author's specificity of the perception of color by the writer and the adequate associative connection of color combinations arising from the reader.

Creating a masterfully figurative picture or model of a certain ethnic group in the context of a work of art is an important task of every writer who conveys his vision of the world through different semantic groups of words as elements of artistic imagery. This also applies to the corresponding group of vocabulary denoting color and light.

The semantic group of words denoting color is used in any work of art: in one the frequency of use of color designations is greater, in the second - less. Selected literary works on historical themes by V. Ipatova and V. Korotkevich are widely saturated with color vocabulary, which deserves a multifaceted analysis.

The perception of the artistic word is an individualized phenomenon and is unique in the history of national literature and culture in general. The writers virtually penetrated into ancient events, rites and customs, skillfully described their heroes, national color, ethnic culture, social and spiritual life not only of Belarusians but also of other nations. The authors have made extensive use of the color palette, which involuntarily attracts the attention of readers and affects their figurative imagination.

The peculiar style of writing of each author, the lexical and systemic organization of their texts, which organically include coloronyms, give the opportunity to vividly imagine the verbal picture of the world created by the writer. It should be noted that when describing a broad historical panorama, the authors often use color in the lexical microsystem as a means of creating a highly artistic text. Language in works of art of the historical genre acts not only as a means of communication, but also as a carrier of artistic imagery.

**Keywords**: coloronym; luxonym; means of artistic imagery; author's style; perception of the artistic word.

Вывучэнне спецыфікі лексічнай арганізацыі тэкстаў гістарычнай прозы, функцыянаванне слова як элемента вобразнасці ў моўнай тканіне мастацкіх твораў заўсёды было і ёсць аб'ектам вывучэння беларускіх лінгвістаў. Гэта значыць, што ўсебаковы творчы аналіз, пераасэнсаванне ўнутранай формы і

[*] **Міхаіл Шаўчэнка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі ўстановы адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна» (Мазыр, Рэспубліка Беларусь); e-mail: mi6363@mail.ru.

зместу літаратурнага маўлення, якое закранае ў першую чаргу сферу духоўна-маральнага і сацыяльна-культурнага жыцця беларускага народа, з'яўляецца лагічным і паслядоўным у лінгвістычнай прасторы беларусаў. Мова кожнага пісьменніка ўбірае ў сабе характэрныя рысы беларускага этнасу, дазваляе чытачу асэнсаваць празаічныя творы, зразумець мастацкія прыёмы і стылістычныя фігуры, якія з'яўляюцца сродкам выяўлення вобразнасці ў мастацкіх творах. Мова, як слушна заўважае Ф. Буслаеў, «не толькі выяўленне разумовай здольнасці народнай, але і ўсяго побыту, нораваў і звычаяў краіны і гісторыі народа» [Буслаев 1941, с. 230]. Стварыць па майстэрску вобразную карціну або мадэль пэўнага этнасу ў кантэксце мастацкага твора – важная задача кожнага пісьменніка, які перадае сваё бачанне свету праз розныя семантычныя групы слоў як элементаў мастацкай вобразнасці. Гэта датычыць і адпаведнай групы лексікі, якая абазначае колер і святло.

Дадзеная семантычная група слоў выкарыстоўваецца ў любым мастацкім творы: у адным частотнасць ужывання колераабазначэнняў большая, у другім – меншая. Менавіта гэтая акалічнасць і стала асноўнай пры выбары мастацкіх тэкстаў для аналізу. Выбраныя літаратурныя творы на гістарычную тэматыку В. Іпатавай і У. Караткевіча шырока насычаны колеравай лексікай, якая патрабуе шматаспектнага аналізу.

Успрыняцце мастацкага слова – з'ява індывідуалізаваная і з'яўляецца ўнікальнай у гісторыі нацыянальнай літаратуры і культуры ў цэлым. На старонках мастацкіх твораў В. Іпатавай і У. Караткевіча паўстае велічная мінуўшчына нашай краіны з яе нацыянальна-культурнымі вытокамі, якія вобразна ствараюць беларускую мадэль свету. Пісьменнікі віртуальна пранікліся ў старадаўнія падзеі, абрады і звычаі, па-майстэрску апісалі іх герояў, нацыянальны каларыт, этнічную культуру, сацыяльнае і духоўнае жыццё не толькі беларусаў, але і іншых народаў. Пры гэтым аўтары шырока выкарысталі колеравую палітру, якая міжволі прыцягвае ўвагу чытачоў і ўздзейнічае на іх вобразнае ўяўленне.

Своеасаблівая манера пісьма кожнага аўтара, лексічна-сістэмная арганізацыя іх тэкстаў, у склад якіх арганічна ўваходзяць і каларонімы, даюць магчымасць ярка ўявіць славесна створаную пісьменнікам карціну свету. Патрэбна зазначыць, што пры апісанні шырокай гістарычнай панарамы аўтары вельмі часта ўжываюць у лексічнай мікрасістэме колераабазначэнні як сродак стварэння высокамастацкага тэксту.

Мова ў мастацкіх творах гістарычнага жанру выступае не толькі як сродак камунікацыі, але і як носьбіт мастацкай вобразнасці. Неабходнасць разгляду стылістычнай функцыі каларонімаў абумоўлена тым, што ў межах літаратурнага твора каларонімавыя лексемы выконваюць мастацка-вобразную функцыю, аказваюць уплыў на свядомасць чытача, спрыяюць фарміраванню мастацкага густу. Як адзначаў нямецкі паэт і навуковец І. Гётэ, у «сваіх самых агульных элементарных праяўленнях незалежна ад будовы і формаў таго матэрыялу, на паверхні якога мы яго ўспрымаем, колер аказвае пэўнае ўздзеянне на пачуццё зроку, а праз яго і на душу: здольны выклікаць пачуцці, абуджаць эмоцыі» [Гётэ 1975, с. 240]. Аналіз колераабазначэнняў без разгляду іх мастацка-вобразнага значэння ў тэксце літаратурнага твора не дае аб'ектыўнага ўяўлення пра каларонімы як тэкстаўтваральныя сродкі. Спецыфіку ўжывання і значэнне каларонімаў у гістарычнай прозе В. Іпатавай і У. Караткевіча можна вызначыць пры дапамозе розных моўна-выяўленчых сродкаў.

Пераважная большасць каларонімаў, выкарыстаных аўтарамі ў тэкстах, належыць да марфалагічнага разраду прыметнікаў. Прыметнікі характарызуюцца тым, што «даюць магчымасць выражаць самыя разнастайныя па сваёй эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўцы прыметы і якасныя рысы прадметаў і з'яў» [Цікоцкі 1995, с. 114].

Мастацка-вобразная функцыя прыметнікаў рэалізуецца ў пэўным кантэксце. Напрыклад, у тэксце трылогіі «Гаспадары Вялікага княства» В. Іпатавай і «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча колеравыя азначэнні выступаюць як самастойныя эпітэты, а таксама ўжываюцца ў складзе іншых мастацкіх тропаў: *Сонечную раніцу, рыпенне **жоўтага** вільготнага пяску пад поршнямі, росны след цэркаўкі і рыцара* [Іпатава 2002 с. 468]; *І раптам рынулі, узляцелі яркія, як ёлачныя цацкі, **малінавыя, зялёныя, сінія, жоўтыя** агні* [Караткевіч 1989, т. 5, с. 19]. У прыведзеных прыкладах лексема *жоўты* семантычна і сінтаксічна не звязаная – яе выдаленне з тэксту не парушае лагічнай структуры. У лексіка-семантычным радзе эпітэтаў *сонечны, вільготны, росны // малінавы, зялёны, сіні,* каларонім *жоўты* выконвае функцыю апісання адной з прымет аб'екта. У іншым кантэксце колеравае азначэнне можа выступаць у ролі сталага эпітэта (напрыклад, у апісанні сокала Фалька): ***жоўтае** пер'е вакол вачэй* [Іпатава 2002, с. 374]; ***жоўтыя** колцы пад ягонымі вачыма* [Іпатава 2002, с. 347].

Адметнасць аўтарскага выкарыстання колеравых азначэнняў як сродкаў мастацкай вобразнасці праяўляецца пры супастаўленні лексічнай спалучальнасці па схеме *колер + назва адзення,* дзе каларонімы выступаюць у блізкіх тэкставых мікраструктурах абодвух аўтараў. Параўнаем апісанне адзення персанажаў аналізуемых раманаў.

| **Каларатыў** | **Назва адзення ў трылогіі В. Іпатавай** | **Назва адзення ў рамане У. Караткевіча** |
|---|---|---|
| белы | кофта, вуаль, сукня, туніка, кашуля, каўнер, плашч | футра, кашуля, шапка, сарочка, світка, нагавіцы, сукны |
| снежна-белы | | вопратка |
| чырвоны | кашуля, сукня, плашч, каптан | гальштук |
| чорны | порткі, убор, плашч | плашч, хустка, фрак |
| шэры | світа, спадніца, порткі | |
| сіні | кашуля | кабацік |
| зялёны/цёмна-зялёны | кашуля, плашчах, сукня | сукенка |
| карычневы | сукня | адзенне |
| ярка-пунсовы | каптан | |
| руды | плашч | |
| пурпуровы | плашч | |
| ліловы | туніка | |
| баршчовы | жупан, куртка | |
| бурачковы | жупан, куртка | |
| блакітны | | мундзір, вопратка |

З прыведзеных дадзеных апісання адзення герояў вынікае, што В. Іпатава значна шырэй выкарыстоўвае колеравыя эпітэты ў сваіх раманах, чым У. Караткевіч. Аднак, пры апісанні знешняга выгляду герояў у мастацкіх творах абодвух аўтараў *белы* колер стаў вызначальным і выступае як неад'емная частка мастацкага вобраза. Магчыма гэта тлумачыцца тым, што на выбар аўтарам колеравых эпітэтаў уплываюць наступныя фактары: 1) аўтарская задума, адметнасць аўтарскага светабачання; 2) сацыяльнае становішча героя; 3) гістарычная эпоха, у якой адбываецца дзеянне; 4) традыцыйная вопратка беларусаў. А самае галоўнае тое, што *белы* колер для беларусаў з даўніх часоў з'яўляецца сімвалам чысціні і свабоды, што ён гарманічна спалучаецца ў назве краіны. У такім выпадку мы маем справу не толькі з элементамі ўласна-аўтарскай каларыстыкі, а і са спалучэннямі нацыянальных колераў.

Замацаванне ізаляваных колеравых азначэнняў пры апісанні вопраткі герояў уласціва мастацкаму стылю як В. Іпатавай, так і У. Караткевіча. Праз іх аўтары перадаюць важныя дэталі, якія характарызуюць прадмет і выклікаюць у чытача вобразнае ўяўленне. Што датычыць структуры колераэлементаў, то патрэбна адзначыць, што пісьменнікі карыстаюцца простай структурай і амаль не ўжываюць у сваіх мастацкіх апісаннях адзення слоў-кампазітаў і колеравых сінонімаў.

Функцыянаванне колера-светлавой лексікі выразна прасочваецца пры партрэтнай характарыстыцы герояў, у прыватнасці, пры апісанні вачэй. Параўнаем апісанне вачэй персанажаў у гістарычнай прозе двух аўтараў.

Даследаваны матэрыял паказвае, што пры апісанні вачэй колера-светлавая камбінацыя лексікі В. Іпатавай уключае наступныя лексемы: *вогненнавокі, фіялкавыя, бліскучыя, блакітныя, халодна-блакітныя, блакітныя з сярэбрана-металічным бляскам, шэрыя, сінія, тавусінавыя, зялёныя, фіялетавыя, чырвоныя, зеленаватыя, выцвілыя, чарнавокі, цёмныя, ясныя, светлыя, светлыя да празрыстасці, бляск вачэй, цёмна-жалудовыя, вішнёвыя, бліскучыя вочы-вішні, карыя, чорныя, з каштоўнага агату, вочы-браткі, вочы-фіялкі, шэрыя з зеленаватым адценнем, бяздонна-цёмныя, ззяюць святлом* [Іпатава 2002].

У. Караткевіч уводзіць у тэкст рамана колеравую гаму для апісання вачэй наступнага кшталту: *шэрыя, цёмныя, цёмна-шэрыя, шэравокі, жоўта-бурштынавыя, васільковыя, блакітныя, цёмна-блакітныя, зеленаватыя, чорныя, светлыя, светла-сінія, ярка-сінія, ясныя, наіўна-сінія, цёмныя, цямнейшыя, залаціста-карыя, сінія, пякуча-сінія, бліскучыя, вочы з залатымі іскрынкамі, вочы, як чорныя слівы, вочы, як чорны агонь, вочы, як вугалі, вочы шэрыя, але ў блакіт, вочы, як зялёныя каменьчыкі, аксамітна-цёмныя вочы, празрыстыя, вочы тытунёвага колеру* [Караткевіч 1989].

Характарызуючы розныя гістарычныя перыяды ў мастацкіх творах, можна заўважыць, што абодва аўтары выкарысталі як ізаляваныя колеры, так і колеравыя спалучэнні складанай структуры. Ізаляваныя храматычныя і ахраматычныя колеры (*белы, шэры, чорны, зялёны, блакітны, кары, чырвоны, сіні*) у тэкстах В. Іпатавай і У. Караткевіча ў асноўным супадаюць, а колеравыя спалучэнні (*цёмна-жалудовыя, халодна-блакітныя, шэрыя з зеленаватым адценнем* [Іпатава 2002] // *цёмна-шэрыя, жоўта-бурштынавыя, залаціста-карыя, светла-сінія, ярка-сінія, пякуча-сінія* [Караткевіч 1989]) – гэта індывідуальныя, мастацка-вобразныя колерабачанні пісьменнікаў, што ўспрымаюцца чытачамі на ўзроўні асацыяцый, якія ў іх узнікаюць.

Пры апісанні вачэй герояў Вольга Іпатава шырока выкарыстоўвае *фіялкавы* колер (*Вохкаючы ад таго, што зусім няма часу, яна падабрала для*

*Жывены рэдкай прыгажосці тканіну – якраз пад* ***фіялкавыя*** *вочы ...* [Іпатава 2002, с. 213]; *Уся яна [Гайна] была нейкая не свая:* ***фіялкавыя*** *вочы згаслі, рукі млява ляжалі на каленях* [Іпатава 2002, с. 440]; *Яна гладзела на мяне ветліва, але ў* ***фіялкавых*** *вачах была і цікаўнасць* [Іпатава 2022, с. 366]), а Уладзімір Караткевіч аддае перавагу *сінему* (***Сінія*** *вочы бацькі ззялі цеплынёй, маці ўсміхалася сыну пяшчотна і сумна, як заўсёды* [Караткевіч 1989, т. 4, с. 206]; *Бацька азірнуўся – Алесь убачыў ягоныя вочы, вельмі* ***сінія*** *і прастадушна-хітрыя* [Караткевіч 1989, т. 4, с. 216]; *Агеньчыкі свечак адбіваюцца ў шырокіх і* ***сініх****, як марская вада, вачах* [Караткевіч 1989, т. 5, с. 300]).

Характэрнай адметнасцю вобразна-выяўленчай функцыі колеравай лексікі пры апісанні вачэй з'яўляецца і тое, што аўтары ўжываюць яе неаднолькава. Калі В. Іпатава звычайна ўводзіць у тэкст словы, якія абазначаюць асноўны колер і яго адценні, зрэдку спалучае іх з эпітэтамі, якія не нясуць колеравай інфармацыі, то У. Караткевіч вельмі часта побач са словам *вочы* ўжывае эмацыянальна-экспрэсіўную дадатковую параўнальную канструкцыю з каларатывам. (Параўн.: *Мне здалося, што Гайна – у белай кашулі, з распушчанымі белымі валасамі, з* ***агромністымі вачыма-фіялкамі*** *– ляціць проста на мяне* [Іпатава 2002, с. 407–408] // *Вялізныя іхнія* ***вочы*** *былі,* ***як чорныя слівы*** [Караткевіч 1989, т. 4, с. 59]).

У творах В. Іпатавай і У. Караткевіча фларыстычныя лексемы могуць адносіцца да прыметнікаў (*вішнёвы, васільковы, жалудовы, каштанавы, фіялкавы, тытунёвы*) або назоўнікаў са значэннем колеру (*вішня, браткі-фіялкі*). Апісальныя сінтаксічныя канструкцыі прысутнічаюць у творах абодвух аўтараў, напр.: *падобныя на спелыя вішні; вочы нагадваюць колерам браткі; колеру ранішніх братак-фіялак; глядзеў бліскучымі вачыма-вішнямі*. Асноўнае адрозненне заключаецца ў выбары аўтарамі фларыстычнай лексемы.

Іншы раз У. Караткевіч, апісваючы вочы герояў, карыстаецца люксонімамі, якія ў мікракантэксце становяцца асновай сінтаксічнай фігуры кантрасту, напр.: *Побач з ім Альберт Фан дэр Фліт з халоднымі вачыма, якія нягледзячы на* ***светлы колер****, былі* ***цьмянымі, як сутонне*** [Караткевіч 1989, т. 4, с. 337].

Для ўзмацнення эмацыянальнай выразнасці тэксту, стылістычнага яго эфекту ён ужывае кантрасныя эпітэты да прадметаў ці рэчываў, якім не характэрныя пэўныя колеравыя якасці. Гэтым самым аўтар дасягае ў значнай ступені лексічнага (семантычнага) напаўнення: *... было ўжо зусім цёпла, брук нагрэўся, а апошні* ***чорны снег*** *ляжаў толькі ў вечным цяню процілеглай аркады двара* [Караткевіч 1989, т. 4, с. 337]. Снег у рэальным прыродным асяроддзі заўсёды белы па колеру, нават калі і апошні. Ён можа быць бруднаваты, але ж не чорны.

Колеравыя лексемы могуць выступаць у ролі «свабодных» эпітэтаў, або быць уключанымі ў склад метафар і параўнанняў. У структуры аўтарскіх метафар каларонімы выступаюць у розных марфалагічных варыянтах: *Бывала, што людзі праляталі праз* ***чырвонае пекла*** *так хутка, што на іх амаль не заставалася следу* [Іпатава 2002, с. 405]; *Зараніца рассекла сваім мячом цемру і ў шчыліну* ***хлынуў багрэц*** [Іпатава 2002, с. 388]; *... і цэлы дзень вілася* ***шэрай змяёй*** *чарга па дармавое* [Іпатава 2002, с. 468]; ***Зеленаватыя*** *вочы жандара не бегалі* [Караткевіч 1989, т. 4, с. 288]; *Поўз угору дымок, потым* ***жаўтаваты*** *агеньчык. Зыркі,* ***сіне-чырвоны*** *агонь вырваўся з палону і ахапіў дровы* [Караткевіч 1989, т. 5, с. 68]; ***Чырвань*** *кінулася ў шчокі* [Караткевіч 1989, т. 5, с. 181].

Каларонімы-прыметнікі, якія ўваходзяць у склад метафарычных спалучэнняў, надаюць аўтарскаму стылю большую вобразнасць, дапамагаюць стварыць вобразна-экспрэсіўную характарыстыку з'яў рэчаіснасці, напр.: *Зоркі буйнымі **чырвона-жоўтымі** кроплямі бурштыну віселі над намі* [Іпатава 2002, с. 400]. Мастацкае азначэнне *чырвона-**жоўтым*** ўдакладняе, дэталізуе пейзаж, надае метафары выразнасць. Без дадатковага колеравага азначэння сэнс метафарычнага словазлучэння губляе пэўнасць, паколькі «метафарызацыя будуецца на вельмі акрэсленым і дакладным разуменні пераноснага сэнсу слова» [Цікоцкі 1995, с. 38]: *Тым часам багі кінулі **жменю залатых зярнятак** на **цёмна-сіні покрыў неба**, кажан прашалясцеў просталя маёй рукі, кугікнула сава* [Іпатава 2002, с. 332]. Метафарычная канструкцыя «жменя залатых зярнят» ужываецца як сінонім да лексемы *зоркі*. Аб'ект параўнання ў сказе не называецца. Каларонім ***залаты*** характарызуе аснову для пераносу назвы (колер, а не форма). Метафарычнае словазлучэнне *покрыў неба* без колеравага азначэння ў значнай меры страчвае вобразнасць, яго выяўленчая функцыя паслабляецца.

Такім чынам, у творах аўтараў можна вылучыць сродкі мастацкай вобразнасці, якія адрозніваюцца сваёй арыгінальнасцю, або з'яўляюцца традыцыйнымі для беларускага мастацкага слова і набываюць спецыфічныя рысы, уласцівыя стылю пісьменніка. Аўтарскія метафары выражаюць асаблівасці светаўспрымання пісьменніка як творцы, мастака слова, адлюстроўваюць спецыфіку мастацкага мыслення. Менавіта ў тэксце яны найбольш поўна выяўляюць свае стылістычныя патэнцыі.

Выкарыстанне каларонімаў у якасці сродкаў мастацкай вобразнасці ў тэкстах раманаў В. Іпатавай і У. Караткевіча з'яўляецца адной з вызначальных рыс індывідуальна-аўтарскага стылю. У шэрагу выпадкаў мы назіраем спецыфічныя мастацкія тропы, якія адлюстроўваюць непаўторнасць, індывідуальнасць мыслення аўтара, асаблівасці светабачання. Пры гэтым захоўваецца сувязь з традыцыямі мастацкага пісьма, якія склаліся ў літаратуры раней. Тым не менш, выкарыстоўваючы некаторыя традыцыйныя ўзоры пераносу значэння лексем на аснове колеру, пісьменнікі ўводзяць у структуру мастацкіх тропаў індывідуальна-аўтарскія элементы, раскрываючы патэнцыйныя выяўленчыя магчымасці каларонімаў.

**ЛІТАРАТУРА**

Буслаев, Ф. И. (1941). *О преподавании отечественного языка*. Ленинград, 248 с.

Гётэ, И. В. (1975). *Об искусстве*. Москва, 240 с.

Іпатава, В. (2002). *Альгердава дзіда*: раманы. Мінск, 608 с.

Караткевіч, У. (1989). *Збор твораў у 8 т.* Мінск, т. 4. Каласы пад сярпом тваім, кн. 1, 399 с.; Мінск, т. 5. Каласы пад сярпом тваім, кн. 2, 527 с.

Цікоцкі, М. Я. (1995). *Стылістыка беларускай мовы*. Мінск, 294 с.

*Подано до редакції 28.03.2021 року*
*Прийнято до друку 27.04.2021 року*